**Литература**

1. Гачев, Г. Американский образ мира, или Америка глазами человека, который ее не видел / Г. Гачев // Национальные образы мира. Космопсихо-логос.— М., 1995.

2. Паррингтон, В. Основные течения американской мысли. В 3-х томах / В. Л. Паррингтон.— М. : Изд-во иностранной литературы, 1962.

3. Тромпенаарс, Ф. 4 типа корпоративной культуры / Ф. Тромпенаарс.— М. : Попурри, 2012.

*С. П. Забелаў*
Мінск, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

## Тэндэнцыі культурна-гуманітарнага жыцця беларускай супольнасці ў Польшчы ў 1991–1994 гг.

Пасля Другой сусветнай вайны нацыянальныя меншасці ў Польшчы фактычна былі пазбаўлены магчымасцяў ажыццяўляць грамадска-культурную дзейнасць. Толькі ў кастрычніку 1956 г. нацыянальныя меншасці атрымалі права арганізоўваць свае аб’яднанні, якія, тым не менш, знаходзіліся пад кантролем і ў фінансавай залежнасці ад Міністэрства ўнутраных спраў. Такой магчымасцю скарысталіся беларуская, літоўская, руская, чэшская і славацкая, нямецкая, яўрэйская і украінская меншасці. Аднак ужо ў 1976 г. Цэнтральны Камітэт Польскай Аб’яднанай Рабочай партыі прыняў рашэнне аб маральна-палітычным адзінстве польскай нацыі, што мела негатыўныя наступствы для дзейнасці аб’яднанняў нацыянальных меншасцяў [6, с. 115].

Пасля цяжкіх для беларускага нацыянальнага жыцця ў Польшчы часоў у 1970–1980-я гг. змены грамадска-палітычнай сітуацыі у 1989–1991 гг. дазволілі выправіць становішча да лепшага. На пачатку 1990-х гг. у польскіх школах беларускую мову вывучалі 3677 чалавек, а ў беларускіх ліцэях у Гайнаўцы і ў Бельску займаліся 630 вучняў. У ліцэі ў Гайнаўцы выкладанне прадметаў вялося на польскай мове, аднак 4 гадзіны на тыдзень адводзілася на вывучэнне беларускай мовы, літаратуры, культуры і гісторыі Беларусі. Беларуская філалогія як спецыяльнасць для славяністаў была ўведзена ў Люблінскім універсітэце, а ў Ягелонскім універсітэце выкладаўся курс беларускай мовы [2, с. 9].

Паводле дадзеных апошнга перапісу насельніцтва Польшчы 2011 г., беларускае насельніцтва краіны склала 43 878 чалавекі, паменшыўшыся ў параўнанні з перапісам 2001 г. прыблізна на 4 тыс. (у 2001 г.— 47 640). Найбольшую долю беларусы складалі ў чатырох паўднева-сходніх паветах Беластоцкага ваяводства: 39,2 % — у Гайнаўскім павеце, 19,8 % — у Бельскім, 3,46 % — у Семятыцкім, 3,2 % — у Беластоцкім. У 12 гмінах ваяводства доля беларусаў перавышала 20 %, а ў чатырох гмінах (81 % у гміне Чыжы Гайнаўскага павета, 81 % у гміне Дубічы Царкоўныя Гайнаўскага павета, 68 % у гміне Орля Бельскага павета, 84 % у гміне Гайнаўка Гайнаўскага павета) доля беларускага насельніцтва была большай за 50 %. Паводле афіцыйных падлікаў беларуская меншасць з'яўляецца другой найбуйнейшай нацыянальнай меншасцю ў Польшчы пасля нямецкай меншасці (144 236 асоб) [7, с. 113].

У той жа час цэнтральныя ўлады (1976 г.), гмінныя улады (1992 г.) і беларускія арганізацыі Польшчы (1992 г.) ацэньвалі колькасць беларускаў Польшчы ў 180 тыс., 76 тыс. і 400 тыс. асоб адпаведна. Разам з тым даследчык Люцыян Адамчык падкрэсліваў, што дадзеныя анкетных даследванняў не абапіраліся на самадэкларацыі грамадзян, а афіцыйныя звесткі часцяком значна скажаліся па палітычных прычынах. [6, с. 121].

Польская даследчыца Андрыяна Скарупска адзначала пэўныя цяжкасці з дакладным вызначэннем колькасці беларусаў у Польшчы, што, паводле яе меркавання, было абумоўлена недасканаласцю методык падліку (адсутнічала прамое пытанне аб нацыянальнай прыналежнасці), а таксама тым фактам, што колькасць беларусаў вызначалася толькі праз статыстыку, якая фактычна датычылася толькі праваслаўных. Спецыяліст таксама падкрэслівала феномен падвоенай, няпэўнай альбо рэгіянальнай самасвядомасці сярод шэрагу жыхароў беларуска-польскага памежжа [3, с. 214].

Паводле шэрагу польскіх даследчыкаў, падзеі ў Польшчыў 1980-я гг. і трансфармацыя 1989 г. абумовілі новыя з'явы ў свядомасці пэўнай часткі беларусаў Польшчы. Адзначалася ўзрастанне рэлігійнай дзейнасці сярод праваслаўнага гарадскога насельніцтва, што адпавядала агульнаму росту рэлігійнасці польскага грамадства. Актывізацыя беларускага жыцця ў Польшчы ў канцы 1980-х — пачатку 1990-х гг. грунтавалася таксама на змене пакаленняў у беларускай супольнасці. Новае пакален-

не, маючы добрую адукацыю і часцяком гарадскую прапіску, з’яўляючыся сучаснікам «Салідарнасці», было гатовае больш актыўна ўдзельнічаць у беларускім культурна-грамадскім жыцці. Даследчык А. Садоўскі акрэсліў новых прадстаўнікоў беларускай меншасці як «новых беларусаў» (што датычылася як прадстаўнікоў інтэлігенцыі, так і прадпрымальнікаў, якія ўсталёўвалі кантакты з Беларуссю і падтрымлівалі беларускія арганізацыі Польшчы), уключаючы ў іх лік найбольш адукаваных, актыўных і свядомых беларусаў Польшчы, адначасова адзначаючы істотны разрыў паміж імі і «традыцыйнай» часткай беларускай супольнасці [3, с. 216].

Беларускія арганізацыі ў Польшчы атрымалі магчымасць карыстацца пэўнымі датацыямі: у 1990 г. на іх патрэбы было выдзелена 6 млрд. злотых, у 1991 г.— больш за 3 млрд. злотых. У Гайнаўцы распачалося будаўніцтва Музея беларускай культуры. Для вырашэння пытанняў, звязаных з арганізацыяй беларускага нацыянальнага жыцця ў Польшчы, была створана спецыяльная камісія пры міністэрстве культуры [2, с. 10].

Найбуйнейшай і найстарэйшай арганізацыяй беларусаў у Польшчы з’яўлялася заснаванае ў 1956 г. Беларускае грамадска-культурнае таварыства (БГКТ). Да 1988 г. БГКТ было адзіным аб’яднаннем беларусаў Польшчы. Ключавымі накірункамі дзейнасці арганізацыі былі пашырэнне нацыянальнай самасвядомасці, умацаванне прыязных стасункаў паміж беларусамі Польшчы і палякамі, распаўсюджванне інфармацыі аб Беларусі, правядзенне культурных і навуковых мерапрыемстваў беларусаў Польшчы. Нягледзячы на тое, што таварыства традыцыйна канцэнтравала сваю дзейнасць на Беласточчыне, арганізацыя таксама мела свае прадстаўніцтвы ў Варшаве і Гданьску. Паводле польскага даследчыка Ежы Рыхліка, важным крокам ў накірунку фармавання інтэлектуальнай эліты беларусаў Польшчы стала адкрыццё аддзялення беларускай філалогіі ў Варшаўскім універсітэце ў 1956 г. [7, с. 116].

15 сакавіка 1993 г. распачаў дзейнасць Беларускі саюз Рэспублікі Польшча (БСРП), які аб’яднаў шэраг беларускіх грамадска-культурных арганізацый. У прыватнасці, у склад БСРП увайшлі Беларускае літаратурнае таварыства «Белавежа», Беларускае гістарычнае таварыства (БГТ), Праграмная рада «Нівы», Беларускае аб’яднанне студэнтаў (БАС), Беларускае таварыства «Хатка», а таксама палітычная партыя Беларускае дэмакратычнае аб’яднанне (БДА). Па-за межамі Беларускага саюза Рэспублікі

Польшча засталіся БГКТ, Таварыства беларускай культуры (ТБК) і Саюз беларускай моладзі (СБМ). Галоўнымі накірункамі дзейнасці БСРП стаў шырокі спектр пытанняў, звязаных з жыццем беларускай меншасці ў Польшчы: ад мясцовых пытанняў да пытанняў узаемадзеяння з дзяржаўнымі ўладамі [7, с. 117].

Нефармальна сваю дзейнасць Беларускае аб'яднанне студэнтаў распачало вясной 1981 г., знаходзячыся ў апазіцыі да БГКТ, аднак афіцыйна было зарэгістравана толькі ў 1988 г. БАС займала пазіцыю, паводле якой БГКТ мела ператварыцца ў арганізацыю, якая прадстаўляла б інтарэсы беларускай грамады на Беласточчыне. З 1990 г. арганізацыя выступала ў якасці арганізатара музычнага Фестывалю музыкі маладой Беларусі («Басовішча»). З 1992 г. БАС шчыльна супрацоўнічала з Саюзам беларускай моладзі. У 1993 г. БАС упершыню арганізавала Фестываль песеннай паэзіі і аўтарскай песні «Восень бардаў». У 1993–1996 г. арганізацыя дзейнічала ў межах Беларускага саюза Рэспублікі Польшча [7, с. 117].

У 1990 г. пачало сваю дзейнасць Беларускае літаратурнае таварыства «Белавежа», арганізаванае групай літаратараў, што функцыянавала пры БГКТ з 1958 г. Ключавым накірункам дзейнасці таварыства стала папулярызацыя беларускай культуры ў Польшчы. Удзельнікамі таварыства стаў шэраг вядомых беларускіх літаратараў: Надзея Артымановіч, Віктар Швед, Сакрат Яновіч, Міра Лукаш, Ян Чыквін і інш. Апошні стаў старшынёй таварыства. Беларускія журналісты і публіцысты Польшчы ў 1992 г. аб'ядналіся ў Таварыства беларускіх журналістаў. У межах дзейнасці таварыства было арганізавана выданне грамадска-культурнага штомесячніка «Часопіс» [7, с. 117]. Намаганнямі беларускамоўных рэлігійных выдавецтваў рыхтаваліся выпускі штомесячніка «Праваслаўны агляд» і штоквартальнік «FOS» [3, с. 218].

У 1992 г. распачала дзейнасць Праграмная рада штотыднёвіка «Ніва». У яе склад увайшлі прадстаўнікі ўсіх беларускіх арганізацый Польшчы, акрамя БГКТ і ТБК. Беларускае гістарычнае таварыства пачало працу ў 1993 г. Галоўным накірункам дзейнасці стала распаўсюджванне гістарычных ведаў аб беларусах і Беларусі, а таксама фармаванне падстаў талерантных узаемадачыненняў. БГТ ажыццяўляе выданне «Беларускіх гістарычных сшыткаў» [7, с. 118].

15 лютага 1991 г. на надзвычайным кангрэсе таварыства «Польшча — Савецкі Саюз» было трансфармавана ў «Таварыства

супрацоўніцтва Польшча — Усход». Адначасова было выказана меркаванне аб неабходнасці стварэння асобных для двухбаковага супрацоўніцтва па лініі Польшча — Беларусь, Польшча — Расія і Польшча — Украіна [2, с. 37]. У 1991 г. з таварыства «Польшча — Савецкі Саюз» вылучылася група ініцыятараў стварэння «Таварыства Польшча — Беларусь» (ТПБ), устаноўчы з'езд якога прайшоў 21 чэрвеня 1992 г. і сфармуляваў ключавыя прынцыпы і накірункі дзейнасці [5, с. 54].

Пытаннямі падтрымання культурна-грамадскага жыцця беларусаў у Польшчы ў пачатку 1990-х гг. таксама займаліся таварыства «Музей і цэнтр беларускай культуры ў Гайнаўцы», таварыства «Villa Sokrates», таварыства «Музей малой Айчыны» у Студзіводах, таварыства «АВ-ВА» у Беластоку [7, с. 118].

У траўні 1991 г. у Мінску прайшоў Першы міжнародны кангрэс беларусістаў, па выніках якога была ўтворана Міжнародная асацыяцыя беларусістаў. Напрыканцы 1991 г. ўзнікла Польскае беларусістычнае таварыства (ПБТ), заснавальнікамі якога сталі прафесары Альберт Барташэвіч (Варшава), Аляксандр Баршчэўскі (Варшава) і Міхал Кандрацюк (Беласток). На ўстаноўчым сходзе А. Баршчэўскі быў абраны старшынёй ПБТ. Адной з ключавых ініцыятыў ПБТ стала правядзенне штогадовых канферэнцый «Шлях да ўзаемнасці». ПБТ інтэнсіўна супрацоўнічала з Міжнароднай асацыяцыяй беларусістаў, Навукова-асветніцкім цэнтрам імя Ф. Скарыны ў Мінску, Беларускім дзяржаўным універсітэтам, Беларускай бібліятэкай імя Ф. Скарыны ў Лондане, Польскім інстытутам у Мінску [5, с. 62].

Беларускімі аб'яднаннямі Польшчы арганізоўваліся такія мерапрыемствы, як Фестываль музыкі маладой Беларусі «Басовішча», фестываль «Беларуская песня» у Беластоку, Фестываль спяванай песні і аўтарскай песні «Восень бардаў», Міжнародны культурны фестываль «Сяброўская бяседа», «Свята беларускай культуры» у Беластоку, «Свята Купалле» у Белавежы, Польска-беларуская літаратурная майстэрня «Бязмежжа», конкурс паэзіі і процы «Дэбют» [7, с. 118].

У студзені 1992 г. на Польскім радыё услед за ўтварэннем літоўскай і ўкраінскай рэдакцый была ўтвораная і беларуская рэдакцыя. Беларуская рэдакцыя радыё ўключала 6 супрацоўнікаў беларускага і польскага паходжання, якія з'яўляліся выпускнікамі і студэнтамі беларускай філалогіі і Інстытута гісторыі Варшаўскага ўніверсітэта [1, с. 291].

Беларуская рэдакцыя Польскага радыё рыхтавала справаздачы з мерапрыемстваў, якія ладзіліся ў кантэксце развіцця двухбаковых польска-беларускіх адносін: паказы фільмаў і тэатральных спектакляў, канцэрты і навуковыя канферэнцыі, фестывалі і музейныя выставы, інтэрв'ю з дзеячамі культуры [1, с. 293].

Рост колькасці арганізацый беларускай меншасці ў Польшчы і інтэнсіфікацыя іх дзейнасці праявілася і ў палітычнай сферы. У красавіку 1989 г. у асяроддзі беларускіх аб'яднанняў было прынятае рашэнне аб утварэнні ўласнага Беларускага выбарчага камітэта (БВК) для самастойнага ўдзелу ў чэрвеньскіх выбарах у Сейм і Сенат. Кандыдатам у Сейм быў вылучаны гісторык Яўген Мірановіч, кандыдатам у Сенат стаў літаратар С. Яновіч. Апошні (кандыдат ад БВК) атрымаў на выбарах 22,5 тыс. Галасоў, альбо 8,5 %.

10 лютага 1990 г. адбыўся ўстаноўчы з'езд Беларускага дэмакратычнага аб'яднання (БДА), якое стала адзінай партыяй у Польшчы, створанай нацыянальнай меншасцю. [93b, с. 124]. У прынятым Статуце ў якасці ключавой мэты партыі было адзначана «замацаванне тоеснасці беларускага народа ў Рэчы Паспалітай і абарона яго палітычнага, культурнага, рэлігійнага і нацыянальнага суверэнітэту» [4, с. 72].

Тым не менш, партыі не ўдалося дасягнуць значных поспехаў на выбарах. Паводле меркавання Ежы Рыхліка, няўдача партыі была звязаная з тым, што БДА успрымалася ў якасці прадстаўніка плыні «Салідарнасці», а не ў якасці прадстаўніка ўласна беларускага насельніцтва [7, с. 124]. У той жа час даследчык А. Садоўскі адзначаў, што, нягледзячы на паражэнне на выбарах, беларускія кандыдаты атрымалі значную падтрымку з боку выбаршчыкаў [3, с. 218].

У 1991 г. падчас парламенцкіх выбараў у беластоцка-сувалкаўскай выбарчай акрузе паміж сабой спаборнічалі два выбарчыя камітэты, якія разлічвалі на падтрымку беларускага насельніцтва,— БДА і Выбарчы камітэт праваслаўных (ВКП). Адсутнасць адзінай уласна беларускай платформы прывяло да таго, што большасць выбаршчыкаў аддалі перавагу не беларускім выбарчым камітэтам, а спісу Сацыялістычнай левіцы дэмакратычнай (СЛД). У выніку ВКП атрымаў 4,3 %, а БДА— 1,4 %. Галасы, набраныя Выбарчым камітэтам праваслаўных, дазволілі атрымаць мандат дэпутата Сейма Яўгену Чыквіну. Падобным чынам склалася і сітуацыя падчас парламенцкіх выбараў 1993 г., калі ВКП зноў змагло набраць толькі 4 % галасоў і не змагло атрымаць прадстаўніцтва ў польскім

Сейме. Тым не менш, беларуская меншасць была прадстаўлена ў Сейме праз кандыдатаў, якія балатаваліся па агульнапольскіх спісах. У 1993–2001 гг. дэпутатам Сейма быў Сяргей Плева, які з'яўляўся кандыдатам ад СЛД [7, с. 124].

На прэзідэнцкіх выбарах 1990 г. беларускія выбаршчыкі пераважна аддалі свае галасы на карысць Уладзімежа Цімашэвіча, які разглядаўся ў якасці «свайго чалавека з гучным іменем». Непапулярнасць «Салідарнасці» сярод беларускіх выбаршчыкаў, паводле А. Садоўскага, грунтавалася на ўспрыняцці першай як народна-каталіцкага руху, непрыхільнага да праваслаўю і беларушчыне [3, с. 219].

У пачатку 1990-х гг. большасць беларусаў Польшчы з'яўляліся прыхаджанамі Польскай аўтакефальнай праваслаўнай царквы пераважна на тэрыторыі двух дыяцэзій: варшаўска-бельскай і беластоцка-гданьскай. Польская аўтакефальная праваслаўная царква з'яўлялася другой найбуйнейшай царквой у Польшчы, уключаючы 6 дыяцэзій, 21 дэкана і 243 парафіі і ахопліваючы 600 тыс. вернікаў. Набажэнствы праводзіліся на царкоўнаславянскай мове, а казанні па-польску альбо па-руску [7, с. 124].

Паводле падлікаў «Таварыства Польшча — Беларусь», намер ажыццяўляць шчыльнае культурна-гуманітарнае супрацоўніцтва з усходнімі суседзямі, у тым ліку з Беларуссю, дэкларавалі больш за 750 некамерцыйных арганізацый Польшчы, аднак рэгулярныя самастойныя мерапрыемствы ладзіліся толькі 70 аб'яднаннямі [5, с. 58].

Такім чынам, ключавой тэндэнцыяй 1991–1994 гг. стаў значны рост інтэнсіўнасці і разнастайнасці праяў беларускага культурнага жыцця ў Польшчы, што ўвасобілася ў дзейнасці грамадскіх, асветніцкіх, адукацыйных, забаўляльных і іншых фармальных і нефармальных аб'яднанняў і ініцыятыў.

## Літаратура

1. Баршчэўская, Н. Удзел беларускай рэдакцыі Польскага радыё ў працэсе будаваньня новых польска-беларускіх адносін / Н. Баршчэўская // Беларусь паміж Усходам і Захадам : праблемы міжнацыянальнага, міждзяржаўнага і міжкультурнага ўзаемадзеяння, дыялогу і сінтэзу : мат. II Міжнароднай канферэнцыі беларусістаў, Мінск, май 1993 г.— 1997.— Мінск.— С. 291–294.

2. Кавалевіч, М. Беларускае школьніцтва ў Польшчы і польскае на Берасцейшчыне / М. Кавалевіч // Беларуска-польскае ўзаемадзеянне

ў галіне культуры : мат. нав.-практ. канф., Брэст, 1993 г.— 1993.— Брэст.— С. 7–10.
3. Скарупска, А. Беларуская меншасць у Польшчы / А. Скарупска // Polska i Białoruś po rozszerzeniu Unii Europejskiej.— 2005.— Warszawa.— S. 213–221.
4. Снапкоўскі, У. Беларуска-польскія сувязі ў 1980-я гг. / У. Снапкоўскі // Беларусь — Польша: путь к сотрудничеству : мат. науч.-практ. конф., Минск, 11 ноября 2004 г.— 2005.— Минск.— С. 66–73.
5. Хмяліньскі, Б. Грамадскі рух у Польшчы за добрасуседства з Беларуссю (1991–2006 гг.) : дысертацыя на атрыманне вучонай ступені доктора гістарычных навук: 07.00.15: абаронена 20.06.07: зацверджана 12.12.07 / Хмяліньскі Баляслаў ; навуковы кансультант Лойка Л. В. — Мінск : БДУ, 2007.
6. Adamczyk, L. Mniejszości narodowe w Polsce w 1992 roku / L. Adamczyk // Białoruś, Czechosłowacja, Litwa, Polska, Ukraina. Mniejszości narodowe w świetle spisów statystycznych XIX–XX w.— 1996.— Lublin.— S. 113–122.
7. Rychlik, J. Realizacja praw mniejszości białoruskiej w Polsce i mniejszości polskiej na Białorusi / J. Rychlik // Dziedzictwo pogranicza: realizacja praw mniejszości polskiej na Litwie, Białorusi, Ukrainie i w Czechach oraz mniejszości białoruskiej, litewskiej, ukraińskiej i czeskiej w Polsce.— 2013.— Łodź.— S. 113–140.

*Т. В. Зайдаль*
Минск, Белорусский государственный университет

## Передача социокультурного опыта в префигуративной культуре

Социальная динамика, как нам представляется, всегда отставала от технических инноваций. Немецкий философ и теоретик культуры Вальтер Беньямин характеризовал XIX век как «неспособный ответить на новые технологические возможности новым социальным порядком» [1, p. 94]. О XX веке американский социолог Дэниел Белл писал: «В настоящем столетии решающее значение для экономической и социальной жизни, для способов производства знания, а также для характера трудовой деятельности человека приобретет становление нового социального уклада, зиждущегося на телекоммуникациях» [2, с. 331]. Тем отчетливее виден темп изменений, который приобрели после наступления цифро-